# РАЗВІЦЦЁ ТВОРЧЫХ ЗДОЛЬНАСЦЯЎ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ

*Беразюк Анастасія Віктараўна*

УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»

Творчасць малодшага школьніка – гэта стварэнне ім арыгінальнага прадукта, у працэсе працы над якім самастойна выкарыстоўваюцца засвоеныя вучнем веды, уменні і навыкі. Творчая дзейнасць развівае творчыя здольнасці школьніка, якія ўлючаюць у сябе развіццё творчага ўяўлення, назіральнасці, творчага мыслення.

Любую дзейнасць, у тым ліку і творчую, можна прадэманстраваць у выглядзе пэўных заданняў, што «патрабуюць ад вучняў творчай дзейнасці, у якіх вучань павінен сам знайсці спосаб рашэння, выкарыстаць веды ў новых умовах, стварыць нешта суб’ектыўна (некаторы раз і аб’ектыўна) новае» [1]. У кожным творчым заданні ёсць пэўнае мысліцельнае дзеянне. Сістэма такіх заданняў – асноўны сродак авалодання метадамі творчасці і развіцця творчых здольнасцяў малодшых школьнікаў.

Творчыя здольнасці вучняў пачатковых класаў развіваюцца ва ўсіх значымых для яго відах дзейнасці. Найважнейшымі ўмовамі развіцця творчых здольнасцяў з’яўляюцца стварэнне творчай атмасферы ў калектыве, стымуляванне творчай актыўнасці праз выкананне разнастайных творчых заданняў.

Творчыя заданні, якія выкарыстоўваюцца на ўроках літаратурнага чытання ў пачатковых класах, можна падзяліць на некалькі груп.

Першая група – гэта заданні, накіраваныя на фарміраванне ў малодшых школьнікаў уменняў успрымаць мастацкі тэкст:

– слоўнікавая праца (чытанне слоў і тлумачэнне іх лексічнага значэння);
– падбор загалоўка да тэксту;
– падзел тэксту на часткі, складанне плана;
– вызначэнне тэмы тэксту, галоўнай думкі;
– вызначэнне тыпу тэксту;
– падбор ілюстрацый да тэксту;
– вызначэнне зместу тэксту па ілюстрацыі;
– складанне дыяфільма;
– выбарачнае чытанне;
– праца па пытаннях настаўніка, падручніка ці вучняў;
– чытанне з мэтай падрыхтоўкі да пераказу твора;
– «Прапушчанае слова»: настаўнік чытае тэкст і прапускае адно слова, вучні павінны ўставіць слова, якое падыходзіць па сэнсе.

Заданні падобнага тыпу садзейнічаюць развіццю ў малодшых школьнікаў назіральнасці, умення бачыць і чуць з’явы жыцця, знаходзіць правільныя словы і выразы для перадачы сваіх уражанняў.

Другую групу складаюць заданні, накіраваныя на фарміраванне літаратурна-творчых уменняў вучняў:

– пабудова да прапанаванага слова ланцужка асацыяцый, метафар, эпітэтаў;

– працяг тэксту па прапанаваным пачатку з прыдумваннем свайго фіналу, уключэннем новых абставін, дзеянняў персанажаў, зыходзячы з іх характараў;

– пераказ тэксту з пэўным заданнем;

– складанне па тэксце крыжаванак;

– віктарыны па адным мастацкім творы ці па некалькіх творах;

– падбор загадак да слоў з мастацкага твора;

– тэматычны падбор прыказак да тэкстаў падручніка;

– складанне рэбусаў да слоў з мастацкага твора;

– праца са слоўнікам фразеалагізмаў.

Трэцяя група заданняў – гэта заданні, з дапамогай якіх ідзе навучанне малодшых школьнікаў прыёмам творчага фантазіравання:

– пафантазіруй, пра што можа думаць, напрыклад,  пчала на кветцы, рыбка ў акварыуме;

– пафантазіруй, што сказалі б пра адно і тое ж  розныя па характары героі, напрыклад, Воўк і Чырвоная Шапачка – пра бабулю;

– прапануй свайго героя; складзі апавяданне ад яго імя;

– пафантазіруй, якім уяўляецца чалавек, калі паглядзець на яго вачамі, напрыклад, ката, сабакі, зайца;

– прыдумай легенду аб кветках, напрыклад, рамонку, валошцы;

– прыдумай фантастычную жывёлу, намалюй і растлумач дэталі яе абрыс, яе фантастычныя здольнасці;

– складзі замалёўкі да тэксту і параўнай іх з тымі, якія ёсць ужо;

– пафантазіруй па малюнку, прыказцы;

– дамалюй вобраз героя, складзі яго дзённік;

– паспрабуй разблытаць тэкст (*Зялёныя сняжынкі распускаюцца ў вясновым паветры. Белыя лісточкі кружацца ў марозным паветры*);

– складзі «магнітны ланцужок слоў»: першае слова называе настаўнік, кожы наступны вучанб паўтарае папярэдняе слова і называае сваё, якое звязана з папярэднім, напрыклад, *кветка, пахне, расліна, сад, белая, ружа* і г.д.;

– прадоўжы тэкст: *Жыла-была Зорачка. Аднойчы раніцай, калі трэба было ўставаць і запальваць сонейка да новага дня, Зорачка ўпала. Адразу стала цёмна і страшна. Што рабіць*?;

– пафантазіруй, аб чым думаюць прадметы: кожнай групе вучняў прапануецца некалькі слоў. Неабходна ад імя гэтых прадметаў, «прачытаўшы іх думкі», адказаць на пытанні «Што я люблю?», «З кім я сябрую?», «Чаго я баюся?», «Пра што я мару?»;

– прыдумаць некалькі варыянтаў канца вядомых казак.

Цікавасць да словатворчасці абуджаюць розныя літаратурныя гульні, асабліваю цікавасць выклікаюць паэтычныя рынгі, трэнінгі «Гуляем ў рыфмы», «Падкажы слова», «Збяры радкі». У працэсе гульні ў малодшых школьнікаў развіваецца пачуццё рытму, вершаваны слых. Гульнявая дзейнасць падштурхоўвае да творчасці.

Уменне бачыць незвычайнае ў звычайным – вельмі важная якасць у характары кожнага чалавека. Вучні пачатковых класаў з задавальненнем выконваюць заданні, якія абуджаюць іх фантазію, развіваюць увагу, мысленне, творчае ўяўленне. Праз выкананне творчых заданняў на ўроках літаратурнага чытання навучанне малодшых школьнікаў становіцца больш цікавым, прыносіць ім радасць пазнання, маральнае задавальненне і пачуццё гонару за свае поспехі.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Унт, И. Э. Индивидуализация и дифференциация обучения / И. Э. Унт. – М. : Педагогика, 1990. – 190 с.